Актуальнае інтэрв’ю да Дня міліцыі

512

04.03.2021 Автор: Katrin

З 1999 года ў Рэспубліцы Беларусь напачатку сакавіка адзначаецца Дзень беларускай міліцыі. Гэта структура, якая забяспечвае грамадскі парадак і законнасць практычна па ўсіх накірунках нашага жыцця. Міліцыя першая паўстае на барацьбу з крыміналам, на абарону правоў і інтарэсаў грамадзян краіны. З’яўляюцца і новыя пагрозы, супрацьстаяць якім даводзіцца вучыцца не «па падручніках», а на практыцы.



Пра здабыткі, праблемы і планы на будучыню мы пагаварылі з **начальнікам райаддзела ўнутраных спраў І.А.АМЕЛЬЯНЧУКОМ**

— Трэба адзначыць, што дасканала наладжаная работа, выкарыстанне сучасных метадаў расследавання і прафілактыкі злачынстваў станоўча паўплывалі на паляпшэнне крымінагеннай статыстыкі мінулага года,— расказвае Ігар Аляксеевіч.— Знізілася колькасць злачынстваў, учыненых у грамадскіх месцах (да 46), непаўналетнімі (да 8) і асобамі, якія маюць судзімасць (да 101).

25 ФЕВРАЛЯ 2024 ГОДА
ЕДИНЫЙ ДЕНЬ ГОЛОСОВАНИЯ
Центральная избирательная комис Республики Беларусь
Брестоблимущество
УСЛУГ АРЕНД
НОВЫЙ АВТОБ
Автопарк №11 г. Пружан
БЕЛГОССТРА
Представительство по Пружанскому району

ПОДПИШИТЕСЬ НА НАС

РУБРИКИ САЙТА

Выберите рубрику

СВЕЖИЕ ПУБЛИКАЦИИ

14.01.2024

Дырэктар «Камбіната кааператыўнай прамысловасці Дзмітрый Красевіч расказаў пр работу і захапленні

Зніжэнне адзначаецца па лініі наркакантролю і процідзеяння гандлю людзьмі, паменшала ў тым ліку і цяжкіх злачынстваў. Да адміністрацыйнай адказнасці за з'яўленне ў грамадскім месцы ў стане наркатычнага ап'янення прыцягнута два грамадзяніны.

Станоўчы ўплыў аказвае прафілактыка, напрыклад, злоўжывання спіртных напояў. А таксама асноўная дзейнасць органаў аховы правапарадку: эфектыўнасць устанаўлення асоб, якія падазраюцца ва ўчыненні злачынстваў з катэгорыі цяжкіх, склала 93,8% пры сярэднеабласным паказчыку 87,8%.



Дзень, вечар, сонца, дождж — у любы час і надвор'е на дарогах раёна дзяжураць супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі. Перад чарговым рэйдам у аб'ектыў фотакамеры трапілі інспектары ДПС П.М.Фядун і С.М.Казмярчук.

— Але ж статыстыка паказвае рост агульнай колькасці злачынстваў у мінулым годзе: у параўнанні з 2019 годам зарэгістравана фактаў супрацьпраўных дзеянняў на 12% больш.

— Прычына ў павелічэнні выпадкаў так званых кіберзлачынстваў — з 40 выпадкаў у 2019-м да 72 — у 2020-м. Аналіз узбуджаных крымінальных спраў паказаў, што значную частку злачынстваў складаюць факты добраахвотнай перадачы пацярпелымі рэквізітаў банкаўскіх картак пасля фальшывых тэлефонных паведамленняў, пераходу па спасылках на махлярскія рэсурсы з гандлёвых пляцовак. Мяркуючы па сёлетняй статыстыцы, працэнт падобных злачынстваў яшчэ ўзрасце.

Таксама рост далі крадзяжы (74 выпадкі), незаконныя дзеянні са зброяй, боепрыпасамі і выбуховымі рэчывамі (8). Удвая больш (22) зарэгістравана цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, па адным з якіх вінаватыя асобы не ўстаноўлены. Увогуле па лініі крымінальнага вышуку ўчынена ў 2020 годзе 147 злачынстваў: 118 крадзяжоў, 1 забойства, 1 наўмыснае прычыненне цяжкіх траўмаў, 1 згвалтаванне, 7 махлярстваў, 5 угонаў аўтатранспарту, 12 хуліганстваў і 2 рабаванні. Пераважная частка зарэгістравана на тэрыторыі Пружан (136), Ружанскага (28), Ліноўскага (27), Шчарчоўскага, Зеляневіцкага (15), Шарашэўскага (14), Шаняўскога (13) і Навазасімавіцкага (10) сельсаветаў. Адзначу, што ў шэрагу злачынстваў была і ўскосная віна пацярпелых, якія не паклапаціліся пра сваю маёмасць, праявілі наіўнасць і даверлівасць або ўвогуле справакавалі сацыяльна неўраўнаважаных грамадзян.

— Ігар Аляксеевіч, у нашай дзяржаве вялікая ўвага надаецца сітуацыі ў сем'ях. У той сацыяльна небяспечнай абстаноўцы, якая пануе ў некаторых дамах, наўрад ці вырастуць сумленныя

14.01.2024

Цэнтралізаваны экзамен будуц праводзіць на базе пружанскаг каледжа

14.01.2024

Адказвае ўчастковы інспектар міліцыі. Калі знойдзецца ўпра на віртуальных махляроў?

13.01.2024

Добры вечар, шчодры вечар усі людзям! Як работнікі Роўбіцкаг СДК захоўваюць народныя традыцыі

13.01.2024

Васьмікласніца пружанскай гімназіі Паліна Дзеева пра ўдзе Галоўнай ёлцы краіны: «Гэта бь сапраўдная навагодняя казка!»

ГОД МІРУ І СТВАРЭННЯ



Наша апытанне. Цуд пачынаецца з… ёлкі

30.12.2023



У перамог ёсць імёны! яны прагучалі падчас раённай цырымоніі «Дараванне 2023» (+многа фота)

29.12.2023



Пружанскія гімназісты пабывалі на экскурсіі ў Савеце Рэспублікі

29.12.2023



Камандную і асабістыя ўзнагароды прывезлі навучэнцы-аграномы Пружанскага каледжа конкурсу «Аграмайстэрства»

28.12.2023



Фірменная прадукцыя 590-годдзя Пружан, вырабы рамеснікаў і многае іншае! Сувенірн лаўка пачала работу ў Пружанах

27.12.2023

БЕЛТА ТЕМА НЕДЕЛИ

грамадзяне. Якая работа вядзецца праваахоўнымі органамі з нядобранадзейнымі сем'ямі?

— Падобная практыка нароўні з асноўнымі задачамі, якія выконвае беларуская міліцыя, асвоена намі дасканала. Сумесная прафілактычная работа разам з работнікамі сацыяльнай, медыцынскай службаў, сістэмы адукацыі і выканаўчых камітэтаў дае свой плён. У сферы процідзеяння сямейнаму насіллю захоўваецца станоўчая тэндэнцыя да зніжэння колькасці бытавых злачынстваў (1 выпадак). Разам з тым, прымаюцца меры па прафілактыцы злачынстваў у выглядзе прэвентыўных (папераджальных) мер уздзеяння. Да адміністрацыйнай або крымінальнай адказнасці прыцягваюцца «кухонныя баксёры», многія з якіх потым асцерагаюцца ў спрэчках прымяняць кулакі. Летась заслужанае пакаранне атрымала 68 сямейных дэбашыраў. Судом Пружанскага раёна прынята рашэнне аб абмежаванні ў дзеяздольнасці трох чалавек, якія злоўжываюць спіртнымі напоямі і, тым самым, ставяць свае сем'і ў цяжкае матэрыяльнае становішча.

Яшчэ адзін прамы вынік паспяховасці прафілактычнай работы — зніжэнне колькасці злачынстваў і супрацьпраўных дзеянняў, учыненых непаўналетнімі.

— Але ж нядаўняя гісторыя з раскрыццём серыі крадзяжоў, якія ўчынілі двое 15-гадовых пружанцаў, узрушыла ўсіх жыхароў горада.

— Калі прааналізаваць тыя пяць крадзяжоў з гаражоў па вуліцы Заводскай і дамоў пружанцаў, якія ўчынілі двое падлеткаў, то незразумелымі застаюцца падставы, якія падштурхнулі непаўналетніх да супрацьпраўных дзеянняў. Хлопцы не мелі ў

сем'ях матэрыяльных цяжкасцей, добра вучыліся і хутка маглі займець спецыяльнасць. На маю думку, прычына ў адсутнасці належнага нагляду з боку бацькоў. На працягу амаль усяго лютага падлеткі прыносілі і захоўвалі дома ўкрадзеныя рэчы — інструменты, прылады, іншыя каштоўнасці. І ніхто з дарослых не задумаўся, адкуль усё гэта ў 15-гадовага хлопца. Цяпер жа змяніць нешта немагчыма: абодва непаўналетнія прыцягнуты да крымінальнай адказнасці, і іх далейшы лёс будзе вырашаць суд.

Віну дарослых пацвярджае і іншая статыстыка. Летась выяўлены 1 факт рэалізацыі алкаголю непаўналетнім. Прыцягнута да адказнасці 10 бацькоў за невыкананне абавязкаў па суправаджэнні непаўналетніх у начны час.

Відавочна, што над прафілактыкай падобных праяў нам таксама трэба працаваць у будучым.

Павышаная адказнасць патрабуецца ад участковых інспектараў міліцыі. На здымку: С.М.Каляда, Д.С.Казарэнка, С.В. Уродніч і В.А.Міхайлаў.

27-12-2023

Атмосфера музыки, танца и таланта. Новогод бал для молодежи прошел во Дворце Независимости

15-01-2024

"Эко Движ" в А1: собрано более 11 тысяч мобильных устройств для экологически безог переработки

15-01-2024

Глава союза староверов: Папа Римский готов возможность переговоров России и Украины в Ватикане

15-01-2024

Миссию наблюдателей от СНГ на выборах в парламент Беларуси возглавит Сергей Лебед

15-01-2024

Метели, сильный ветер и до -18°С. Синоптики погоде на текущей неделе

15-01-2024

В Баку прогремел мощный взрыв в мебельно цехе, есть погибшие

НОВОСТИ ПРЕДОСТАВЛЕНЫ БЕЛТА ©



—Ведаю, што вострым для райаддзела міліцыі застаецца кадравае пытанне.

— Праблемы з напоўненасцю падраздзяленняў аддзела ўнутраных спраў пакуль застаюцца, але лічыць іх вострымі нельга. Сапраўды, напружанасць службы, адказнасць і высокія патрабаванні да дысцыпліны не ўсе вытрымліваюць. Але касцяк асабовага саставу мае каштоўны вопыт, якім дзеліцца з моладдзю. Магчыма, і добра, што застаюцца не ўсе, а толькі лепшыя. Што і адбіваецца на выніках. Напрыклад, работа пружанскай міліцыі штогод адзначаецца на абласным узроўні. Па агульных выніках службовай дзейнасці ў мінулым годзе мы сталі шостымі ў вобласці, у той жа час група па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю заняла першае месца ў вобласці, дыпломам трэцяй ступені была адзначана крымінальна-выканаўчая інспекцыя. З лепшага боку можна адзначыць службу супрацоўнікаў дарожнай інспекцыі, ізалятара часовага ўтрымання, участковых інспектараў міліцыі, дзяжурнай часці.

Усіх віншую з прафесійным святам, жадаю больш спакойных змен і менш непрыемнасцей. Здароўя і добрага настрою зычу нашым ветэранам, парады якіх патрэбны як маладым супрацоўнікам, так і вопытным афіцэрам.

У аддзяленні па грамадзянстве і міграцыі пераважная большасць работнікаў — жанчыны. Тут заўсёды ідэальны парадак у справах, бо за яго адказваюць пашпартыстка А.А.Панасевіч, інспектар Н.П.Пракапеня і спецыяліст АГіМ А.А.Паўловіч.

Асабліва шчырыя словы з нагоды Міжнароднага жаночага дня адрасую нашым жанчынам, якія нясуць цяжар службы разам з намі, ці то ў райаддзеле, ці дома. Дзякуй вам за падтрымку, за тое, што не дазваляеце нам страціць душэўную цеплыню, веру і дабрыню.

Гутарыў Алег СІДАРЭНКА. Фота Кацярыны МАСІК.

Категория *Новости, Профессия*

одноклассники

‹ **Предыдущая запись**
Сябруй з «раёнкай» і… частуйся мяснымі далікатэсамі

Следующая запись ›
Кожны трэці работнік ААТ «Агра-Калядзічы» — прадстаўніца прыгожай паловы чалавецтва

ГЛАВНЫЙ РЕДАКТОР

Ильющенко Виктор Михайлович

8-01632-4-02-80

КОНТАКТЫ

Наш адрес:
г. Пружаны. ул. Красноармейская, д. 78

E-mail редакции:
RRBud2@brest.by

Приём рекламы:
8-01632-4-03-60, 8-01632-4-03-55

Бухгалтерия:
8-01632-4-03-60

Ответственный секретарь:
8-01632-4-01-08

Корреспонденты:
8-01632-4-03-02,
8-01632-4-03-55,
8-01632-3-58-81

ПОДПИСКА



З газетай па жыцці — пружанец Васіль Радзівончык

31.12.2023



Застаюцца лічаныя дні, каб афарміць падпіску на «Раённыя будні»

27.12.2023

САМОЕ КОММЕНТИРУЕМОЕ

Расписание движения поездов по железнодорожной станции Оранчицы + расписание движения автобусов по маршруту Пружаны-Оранчицы-Пружаны + изменение графика движения автобусов по маршруту Пружаны — Засимовичи и Пружаны — Клепачи (действует с 10 декабря 2023) (15)

Расписание движения городских автобусов по остановочным пунктам (4)

КАЛЕНДАРЬ

Январь 2024

Пн	Вт	Ср	Чт	Пт	Сб	
1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	1
15	16	17	18	19	20	2
22	23	24	25	26	27	2
29	30	31				

« Дек



900
491
416

© 2017 Пружаны | «Раённыя будні» | Все права защищены.